

Прачытай.

## Настаўніца

Я хаджу ў першы клас. Маю настаўніцу завуць Мар’я Фёдараўна. Яна вучыць нас чытаць і пісаць.

Спішы тэкст. Карыстайся памяткай.

Настаўніца

Я

## Правілы спісвання

1. Прачытай.
2. **Закрый узор**. Паўтары па памяці.
3. **Адкрый узор**. Прачытай, вымаўляючы словы па складах.
4. **Закрый узор.** Паўтары па памяці.
5. Дыктуй сам сабе па складах і запісвай.
6. Правер. Прачытай свой запіс па складах.
7. **Адкрый узор.** Правер па ўзоры.
   Ці ёсць вялікая літара? Падкрэслі яе.
   Правер знак прыпынку ў канцы сказа.

## Правілы пісьма пад дыктоўку

1. Паслухай настаўніка.
2. Паўтары. Выразна вымаўляй кожны склад.
3. Пішы. Дыктуй сабе па складах.
4. Правер сам. Прачытай тое, што запісаў.
5. Правер з настаўнікам.
   Слухай настаўніка і звярай.